# Грахі польскай палітыкі[1]

**Станіслаў Свяневіч**

Сённяшні нумар мы прысвячаем прадстаўленню цяперашняга стану гандлю ў нашым краі. У сувязі з гэтым мы друкуем шэраг інтэрв'ю з выдатнымі арганізатарамі гэтай сферы нашага эканамічнага жыцця. З усіх гэтых спраўных, вельмі аб'ектыўных інтэрв'ю мы мусім зрабіць агульную выснову: гандаль Віленшчыны, у параўнанні з ягоным станам у перадваенныя часы, знаходзіцца сёння ў заняпадзе.

Мы лічым, што гэта выклікана прычынамі, падзеленымі на дзве катэгорыі. Адна з іх – агульныя эканамічныя працэсы, выкліканыя сусветнай вайной і расійскай рэвалюцыяй. Ваенныя катаклізмы зруйнавалі наш край амаль у кожнай сферы эканомікі. Расійская рэвалюцыя закрыла для нас цэлы шэраг важных рынкаў, з якімі нашыя купцы мелі ўсталяваныя сувязі. Усё гэта – вынікі тых вялікіх гістарычных падзей, якія мы перажывалі на працягу амаль 10 гадоў. За гэтыя вынікі мы ні на каго не можам ускладаць адказнасць.

Другая катэгорыя прычын заключаецца ў палітыцы незалежнай Польшчы. У пераломныя 1919–1921 гады Польшча адносна нашага краю ўчыніла вялікі грэх, наступствы якога яшчэ доўга ў гістарычнай будучыні будуць адгукацца на справах краю і на лёсе Рэчы Паспалітай як вялікай дзяржавы. Гэтым грахом, вялікім грахом супраць ідэалаў мінулага, а таксама супраць здаровага сэнсу, быў дазвол на падзел земляў Вялікага Княства Літоўскага штучнымі дзяржаўнымі межамі. У 1921 годзе мы былі пераможцамі; шлях да аднаўлення былой вялікай Рэчы Паспалітай быў адкрыты. З-за дурноты і дылетанцтва стваральнікаў Рыжскай мірнай дамовы, з-за мізэрнасці духу польскага грамадства, з-за хісткай палітыкі ў дачыненнях з Ковенскай Літвой мы страцілі тыя вялікія магчымасці, якія раней адкрываліся перад Польшчай. Толькі група віленскіх федэралістаў, а таксама асобныя адзінкі, якія ўздымаліся над агульным узроўнем тагачаснай польскай палітычнай думкі, як, напрыклад, біскуп Лазінскі[2], праводзілі адпаведную лінію паводзін.



[1] Перакладзена паводле: Bor. [Swianiewicz, Stanisław] (1926). "Grzechy polityki polskiej". *Kurjer Wileński,* 21.11.1926.

[2] Лазінскі (Łoziński) Зыгмунт (1870–1932) – рыма-каталіцкі святар, у 1918–1925 гадах – біскуп

Памыляецца той, хто лічыць, што ідэал непадзельнасці земляў былога Вялікага Княства Літоўскага і ідэал польска-літоўска-беларуска-ўкраінскай федэрацыі – гэта толькі праява пэўных палітычных сімпатый, асабістых прыхільнасцяў летуценнікаў, што ганяюцца за ценямі вялікай мінуўшчыны. Федэралісцкі ідэал – гэта таксама і ўвасабленне эканамічных інтарэсаў нашых земляў, гэта мара пра буйны жыццёвы росквіт, пра стварэнне ўмоў для павышэння прадукцыйнасці краёвай вытворчасці, пра сотні тысяч тон грузаў, якія перавозяцца па нашых рэках і па нашых чыгунках.

Дастаткова павярхоўнага погляду на карту, каб пераканацца, што само геаграфічнае становішча звязвае паміж сабой землі, якія ляжаць паміж Балтыйскім і Чорным морамі. Геаграфічнае становішча проста навязвае літоўска-беларуска-ўкраінскім землям вертыкальную кааперацыю. З незапомных часоў праз гэтыя землі ішоў буйны водны шлях, які злучаў два згаданыя моры. З поўначы на поўдзень, а таксама на паўднёвы ўсход, – гэта значыць больш-менш па вертыкальнай лініі, разгарнулася вялікая арганізацыйная праца ўладаў гістарычнай Літвы. У расійскія часы мы таксама адчувалі вельмі моцныя повязі, якія злучалі басейн Дняпра з басейнамі Нёмана і Дзвіны. Таксама прыблізна ў вертыкальным напрамку ідуць чыгуначныя лініі, якія злучаюць гарады Беларусі і Літвы з балтыйскімі партамі. Сёння гэтыя лініі з гандлёвага пункту гледжання фактычна не эксплуатуюцца.



Такім чынам, вялікім грахом адносна гісторыі, які ўчыніла незалежная Польшча, з'яўляецца тое, што з-за заключэння Рыжскай дамовы, з-за канцэпцыі эндэцка-пэпээсаўскага нацыяналізму[3], з-за хісткай палітыкі адносна Ковенскай Літвы для нашых земляў быў зачынены шлях да аднаўлення натуральнай вертыкальнай кааперацыі. Я сцвярджаю, што куды менш шкоды эканамічнаму развіццю нашага краю прынесла закрыццё рэвалюцыяй шляхоў у глыбіню Расіі, чым гэтае зацісканне межамі з поўдня і з поўначы. З-за адрэзанасці ад Коўна, Лібавы і Клайпеды з аднаго боку, а таксама ад Украіны – з другога, мы перасталі жыць у гаспадарчым плане, а сталі толькі існаваць.

менскі, у 1925–1932 гадах – біскуп пінскі. Падчас заняцця палякамі Менску ў 1919–1920-х гадах адзначыўся як прыхільнік пашырэння беларускасці ў дзейнасці Каталіцкага касцёла. – *Заўвага навуковага рэдактара.*

[3] Маецца на ўвазе інкарпарацыйная канцэпцыя, прапанаваная пасля Першай сусветнай вайны Раманам Дмоўскім. Яна прадугледжвала, што мяжа Польшчы на ўсходзе павінна праходзіць там, дзе будзе магчымая поўная асіміляцыя палякамі нацыянальных меншасцяў. Фактычна была ўвасобленая ў жыццё падчас заключэння Рыжскай мірнай дамовы 18 сакавіка 1921 года. Польскія сацыялісты ідэалагічна злучаныя тут С. Свяневічам з эндэкамі, магчыма, у выніку нейкіх асабістых з імі супярэчнасцяў, паколькі тыя ніколі не салідарызаваліся з поглядамі нацыянальных дэмакратаў у нацыянальным пытанні. – *Заўвага навуковага рэдактара.*

Пішам мы гэта не для таго, каб прыгадваць памылкі мінулага, а таму, што верым – з часам мусіць сціхнуць сляпая і тупая зацятасць польскіх і беларускіх нацыяналістычных дэмагогаў, а таксама будзе вымушана сысці з палітычнай арэны злачынная дурнота маральных лідараў сённяшняй літоўскай дзяржавы. Мы верым, што здаровая палітычная думка і рэальныя эканамічныя інтарэсы з часам мусяць перамагчы. Таму верым і ў магчымасць узнікнення ў будучыні спрыяльных умоў для рэалізацыі федэрацыйных ідэалаў. Такім чынам, мы ставім гэты пункт на галоўнае месца ў сваёй доўгатэрміновай праграме.

Але Польшча мае ў адносінах да нашага краю яшчэ і іншы грэх. Падпарадкоўваючыся эндэцкай канцэпцыі нацыяналістычнай выключнасці, усе папярэднія ўрады намагаліся зніveляваць у нашым краі ўсе мясцовыя адметнасці. Гэта праявілася як у адукацыйнай ды адміністрацыйнай, так і ў эканамічнай палітыцы. Намагаліся нават думкі не дапускаць пра магчымасць існавання такіх асаблівасцяў. Менавіта таму яны тымі самымі законамі, тымі самымі распараджэннямі, з толькі нязначнымі адхіленнямі пачалі цэнтралістычна рэгуляваць справы Галіччыны, Памор’я і Віленшчыны.

Яны не разумеюць, што нельга адныя і тыя ж прынцыпы выкарыстоўваць для паляпшэння зямельных адносін на Памор’і і на Палессі; што норма падатковага абкладання, якая для купца, селяніна ці прамыслоўца ў Познанскім ваяводстве зусім не складаная, у нас можа стаць невыносным цяжарам, які зробіць працу немагчымай; не разумеюць, што пытанне ўладкавання сістэмы мясцовага самакіравання нельга вырашаць аднолькава для ўсіх рэгіёнаў дзяржавы; цэнтралістычна яны хочуць таксама рэгуляваць пытанні, звязаныя з пасляваенным аднаўленнем нашага краю. 

Палітыка ранейшых урадаў у дачыненні ўскраін выклікала незадавальненне амаль ва ўсіх пластах насельніцтва нашага краю (акрамя, натуральна, галіцыйскіх чыноўнікаў і часткі нацыяналістычнай інтэлігенцыі), бо амаль што ўсе на сваёй скуры адчулі дабрадзействы цэнтралізаванага кіравання з Варшавы.

Таму мы смела можам сказаць, што закрануты за пару дзён да гэтага панам Віславухам[4] на старонках нашай газеты лозунг аўтаноміі

[4] Віславух (Wysłouch) Севярын (1900–1968) – польскі гісторык дзяржавы і права, паходзіў са шляхецкага роду на Палессі. З 1927 па 1939 год быў навуковым супрацоўнікам Універсітэта імя Стэфана Баторыя ў Вільні, пасля Другой сусветнай вайны – прафесар і рэктар Уроцлаўскага ўніверсітэта. Аўтар некалькіх грунтоўных прац па беларускім пытанні. – *Заўвага навуковага рэдактара.*

ўсходніх земляў пачынае знаходзіць усё больш прыхільнікаў. Нават сярод нацыяналістычна настроенай часткі польскай грамадскасці нашага краю усё больш пачынае ўтварацца прыдатная псіхалагічная аснова для разумення аўтанамісцкіх лозунгаў. Усё больш людзі ў нас пачынаюць разумець, што калі б у шэрагу нашых спраў інстанцыяй, якая прымае рашэнні, была мясцовая аўтаномная ўлада, мы маглі б пазбегнуць цэлага шэрагу балячак як у нашым адміністрацыйным, так і ў гаспадарчым жыцці.

Мы лічым, што цяпер найлепшы час для таго, каб Польшча пачала выпраўляць памылкі сваёй палітыкі ў дачыненні да нашага краю. Вялікай памылкі знявечання земляў Вялікага Княства Літоўскага штучнымі межамі хутка выправіць не ўдасца. Таму аб’яднанне гэтых земляў у адно цэлае пры адначасовай рэалізацыі федэралісцкай праграмы застаецца для нас у гэты момант толькі ідэалам на далёкую будучыню, які асвятляе нашу грамадскую і палітычную працу. Але цэнтралісцкі кірунак ранейшай польскай палітыкі – гэта памылка, выправіць якую можна ўжо сёння. Усходнія землі мусяць атрымаць аўтаномію. Таму ўжо сёння павінен стаць актуальным праект вылучэння ўсходніх земляў у асобную адміністрацыйную адзінку, што стала б першым крокам да ўстанаўлення на працягу некалькіх найбліжэйшых гадоў у нашым краі аўтаномнага ладу.